Святлана МАГІЛЕЎЧЫК

АПАВЯДАННІ



Святлана Магілеўчык нарадзілася 28 чэрвеня 1980 года ў вёсцы Васількі Бялыніцкага раёна. Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум, цяпер працуе карэктарам у Бялыніцкай раёнцы. З-за працы закінула сваё «пісьменніцтва» на самую далёкую паліцу. Зараз паціху дастае...

ЯНЫ ІДУЦЬ

— Яны ідуць! — гучала з кожнага завулка ў Горадзе.

— Мінакі ўжо блізка, — шапацеў рэпрадуктар. — Замыкайце крамы, хавайце малых дзяцей, адмаўляйце незнаёмым людзям у начлезе і вячэры, абмяжуйце ўсе выхады ў калідоры і на адкрытыя пляцоўкі.

Горад знаходзіўся глыбока пад зямлёй. Ён быў вялікі, некалі нават вельмі вялікі. Калі чытаць падручнік гісторыі, якую вывучаюць у школе, то можна адтуль даведацца, што ў далёкім мінулым людзі жылі высока на паверхні, але здарылася так, што ім стала пагражаць небяспека, і пад зямлёй быў пабудаваны вялізны горад, які засялілі ўцекачы зверху. Біяр не чытаў падручнікаў, а па гісторыі — тым больш. І школу не наведваў ужо даўно. Ад тае пары, калі падземныя воды затапілі некалькі калідораў. Гораду адчайна не хапала рэсурсаў, таму людзі бурылі праходы далей і далей, шукалі спажывы, каб хоць на кароткі час працягнуць сваё нягеглае жыццё. Калі на шляху трапляліся вялікія пусткі, туды адвозілі смецце або будавалі там каменныя пляцоўкі. Гэта былі таксама месцы, дзе збіраўся народ, каб вырашыць важныя справы або правесці сціплыя святы. Нельга было грукацець, хутка бегаць, гучна размаўляць, бо абвалы былі вельмі частыя і лёгка маглі сапсаваць палову Горада. Біяру было шаснаццаць, калі падчас такога абвалу загінуў бацька. Сям'я згубіла галоўнага карміцеля, і маці вызваліла сына ад заняткаў у школе, бо стала цяжка ўтрымліваць дваіх дзяцей адной, а маленькая прадуктовая крамка амаль зусім не прыносіла прыбытку.

— Біяр, цяпер ты будзеш галоўным у нашай сям'і, — аднойчы пасля сняданку сказала мама. — Будзеш насіць глебу для агарода, падмяняць мяне, калі я адпраўлюся на пошукі прадуктаў у Стары Горад. Фрыя будзе хадзіць у школу, дзяўчынцы больш, чым табе, патрэбна адукацыя.

— Давай лепш я пайду ў Стары Горад! — усклікнуў Біяр, а потым згадаў, што павышаць голас нельга, і перайшоў амаль на шэпт: — Мы з татам бывалі там неаднаразова, я не згублюся.

— Нават не думай, — грозна прамовіла мама. — Я не перажыву, калі ты загінеш.

— А ты?

— І я рызыкую, — вельмі ціха сказала мама. — Але калі з табой што-небудзь здарыцца, то мы з Фрыяй будзем асуджаны на галодную смерць. Нам ніхто не дапаможа.

Біяр моўчкі накіраваўся да пакінутай ім працы. Раней у іх былі два пакоі, шмат месца, а цяпер значную частку займала цяпліца: кожны больш-менш пусты кавалачак прасторы мама старалася запоўніць агароднінай, каб хоць крыху прадаць і неяк перабіцца самім. Але і людзі навокал былі небагатыя, шмат тавару бралі напавер, потым адпрацоўвалі або забываліся вяртаць.

Калідоры, па якіх усе рухаліся, былі вельмі вузкія. Не хапала перакрыццяў, буравыя ўстаноўкі зношваліся, а пра тое, каб вярнуцца на паверхню, нават размовы не было. Гэта было найстражэйшым чынам забаронена. Але знаходзіліся тыя, хто выступаў супраць правіл.

Такіх людзей называлі Мінакамі.

Яны з'яўляліся не надта часта.

Яны рухаліся невялікімі групамі па чатыры-пяць чалавек…

Яны ішлі праз Стары Горад.

Яны ішлі на паверхню.

Мінакі былі выгнаннікамі.

Іх нідзе не прымалі, не прадавалі ім ні ежы, ні адзення, не пускалі на начлег. Мінакоў баяліся — асабліва, калі яны пачыналі гаварыць. Са знаёмых Біяра двое пайшлі за Мінакамі. Назад не вярнуўся ніхто.

Назад ніхто ніколі не вяртаўся. Гэтая акалічнасць насцярожвала людзей і прымушала іх не ўступаць ні ў якія стасункі з падарожнікамі.

Біяр зачыніў краму, хуценька адвёў сястру ў пакой і загадаў сядзець вельмі ціха. Маці прымацавала да дзвярэй вялікую засаўку. На калідорах павыключалі святло, пакінулі толькі аварыйныя ліхтарыкі. Усе сядзелі моўчкі і чакалі. Раптам яны пачулі дробны грук у дзверы.

— Нікога няма дома, а я вам не адчыню, — сказала мама тым, хто быў за дзвярыма.

— Рэмі, гэта ты? Я пазнала твой голас, — пачулася з-за дзвярэй. — Я — Марта. Памятаеш мяне?

— Марта? — мама пацягнулася было да засаўкі. — Ты не адна?

— Са мной людзі, — сказала жанчына. — Гэта мае родныя. Пусці нас, калі ласка. У нас ёсць ежа, мы заплацім табе за некалькі гадзін адпачынку. Мы тры дні не бачылі святла, вельмі змарыліся. Нам патрэбна няшмат.

Мама прыбрала рукі Біяра, які паспрабаваў яе затрымаць, і адсунула засаўку. Людзі зайшлі ў пакой і моцна зажмурыліся ад сціплага святла. Твары іх былі вельмі бледныя, па шчоках каціліся слёзы. Біяр схапіў Фрыю за руку і загарадзіў сабою маці.

— Вітаю вас, — сказала жанчына, якая назвалася Мартай. Яна ўжо агледзелася, яе вочы крыху абвыкліся. — Вялікі дзякуй, што прывецілі нас. Гэта мае родныя. Брат Кард, ты яго не памятаеш, Рэмі. Калі мы з табою апошні раз бачыліся, ён яшчэ не нарадзіўся. Мая дачка Нэн і мама. — Людзі нізка схіліліся перад гаспадыняй. Так яны выказалі вялікую павагу да тых, хто прыняў іх. Біяр рэзка накіраваўся да выхада.

— Я прынясу вады! — сказаў ён першае, што прыйшло ў галаву, і выскачыў вонкі. На калідоры хлопец крыху аддыхаўся. Спачатку хацеў папярэдзіць уладу, але

потым усё ж перадумаў, набраў вады і марудна пакрочыў дадому. Ён чакаў убачыць Мінакоў — суровых, загартаваных нягодамі мужчын, а гэтыя… Бездапаможныя жанчыны, дзяўчынка і хлопец прыблізна яго ўзросту.

— Цябе ніхто не бачыў, пакуль ты хадзіў па ваду? — насцярожана спытала мама.

— Не, — адказаў Біяр. Ён падаў вады прыхадням, дапамог ім размясціцца. Мама тым часам прапанавала нечаканым гасцям сціплы полудзень.

— Твой сын стаў сапраўдным мужчынам, — парушыла няёмкае маўчанне Марта. — Калі я яго бачыла ў апошні раз, ён быў зусім маленькім.

— Яму давялося клапаціцца пра нашую сям'ю, калі… калі Холдэн памёр. Зараз мы перажываем не самы лепшы час. — Ціха прамовіла мама.

— Холдэн памёр? — здзіўлена спытала Марта. — Не можа такога быць! Рэмі, ты нешта не дагаворваеш.

— Для мяне ён памёр, — суха адказала мама. З яе вачэй пацяклі злыя слёзы. — Ён стаў Мінаком, як і вы. А гэта значыць — памёр.

— Мама, — усклікнуў Біяр, — значыць тата — жывы? Чаму ты не сказала нам, што ён стаў Мінаком? — Рэмі падышла да сына і прытуліла яго галаву да сябе.

— Таму, — сказала яна, пільна ўглядаючыся яму ў вочы, — што тата пакінуў нас. Ён паабяцаў, што вернецца, але Мінакі ніколі не вяртаюцца. Яны гінуць. Я была супраць, каб твой бацька станавіўся Мінаком, і таму засталася. А вось цяпер ты, Марта… Ты ідзеш у невядомае…

— Не, я ведаю, куды іду, — твар Марты прасвятлеў. — Мы ідзём на паверхню, там ёсць сонца, свежае паветра, вецер, акіяны, горы! Там жывуць людзі!

— Лухта і мана! — прамовіла мама. — Вас абдурылі, абвялі вакол пальца! Нашы ўлады колькі год шукаюць выйсце, але ніхто ніколі не дабіраўся да паверхні, таму што яе няма!

— Я змагу даказаць табе адваротнае, — Марта адхіліла халяву аднаго бота і выцягнула адтуль кавалачак паперы. Гэта была карцінка з нейкай старажытнай кнігі. На ёй — выявы неба, сонца, гор, якія блакітнымі хвалямі абмывае мора. Карцінка была крыху папсаваная, але гэтага было дастаткова, каб Біяр з павагай стаў глядзець на новых знаёмых. Марта беражліва схавала малюнак назад у абутак.

Рэпрадуктар на сцяне раптам ажыў і зашамацеў сваім металічным голасам:

— Надзвычайная сітуацыя! Забіты мэр Горада! Забіты мэр Горада! Ёсць меркаванне, што гэта зрабілі Мінакі. Настойліва просім вас не выходзіць з дамоў, да вас прыйдуць супрацоўнікі аховы. Той, хто затрымае Мінакоў, атрымае вялікую ўзнагароду!

Твары Марты і яе родных збялелі.

— Нас могуць знайсці, Рэмі, — ціха сказала жанчына. — Мы не будзем рабіць табе непрыемнасці. Зараз жа пойдзем далей.

— І куды? — спытала маці Біяра. — Твае родныя змарыліся, ім патрэбны святло і адпачынак. — Яна падышла да малой Нэн, якая заснула на руках у бабулі, і прыкрыла яе коўдрай.

— Біяр, — звярнулася Рэмі да сына, — пабудзь з нашымі гасцямі, а я буду размаўляць з аховай. — Марта падазрона зірнула на былую сяброўку, але тая працягвала:

— Не хвалюйся, я не здам цябе ўладам. Памятаеш, з намі часта хадзіў хлопчык з суседняй вуліцы?

— Прыпамінаю, — нясмела адгукнулася госця.

— Яго звалі Холдэн, як і майго мужа. Зараз ён начальнік аховы на нашым участку. Ён верыць Мінакам, мой муж некалі сябраваў з ім. Я пастараюся пера-

канаць яго, каб не рабіў у нас ператрус. Вам выходзіць вельмі небяспечна, трэба пачакаць нейкі час.

— Дзякуй табе, Рэмі, — расчуленая Марта абняла гаспадыню. — Я нават не ведаю, як табе дзякаваць, нам проста неверагодна пашчасціла, што мы патрапілі да вас!

У дзверы пагрукалі. Рэмі крыху прыцішыла святло і выйшла на калідор. Гэта былі прадстаўнікі аховы. Але Холдэна з імі не было.

— Мы павінны агледзець вашае жыллё, мадам, — гаварыў малады службовец, апрануты ў навюткую форму з бліскучымі знакамі адрознення. — Мінакі прадстаўляюць сур'ёзную небяспеку для грамадства, таму мы просім вас расказаць пра тых, хто пражывае ў вас дома.

Ахоўнік, відаць, распачаў службу не так даўно, таму працу сваю імкнуўся выканаць належным чынам.

— А дзе Холдэн? — спытала Рэмі, каб крыху адцягнуць час.

— Ахоўнік Холдэн хутка з'явіцца, — адрапартаваў службовец. — Я маю права зрабіць у вас агляд. Дазвольце зайсці.

— Калі ласка, — Рэмі адчыніла дзверы. Яе сэрца жаласліва сціснулася.

— Хто гэтыя людзі? — спытаў ахоўнік. — Мінакі?

— Гэта мае сябры, — адказала Рэмі. — Яны прыйшлі з другога канца горада наведаць мяне.

— Вы падманваеце ахову, — цвёрда сказаў службовец. — За гэта вы будзеце арыштаваны, а Мінакі пакараны. — Збірайцеся, — крыкнуў ён на Марту і яе родных.

— Не маеце права! — закрычала Рэмі і ўчапілася рукамі ў новы мундзір ахоўніка. — Мы сапраўды не бачыліся шмат часу. Хадзіць у госці ў нашым Горадзе не забараняецца, — узнікла кароткая валтузня.

— Вы будзеце пакараны і за супраціўленне ўладам, — працягваў ахоўнік. Ён збіраўся выклікаць дапамогу. Рэмі села на падлогу і закрыла вочы рукамі. Паніклая, адчужаная Марта збірала немудрагелістыя рэчы. Кард і Нэн прачнуліся і са страхам глядзелі на ахоўніка.

— Што тут адбываецца? — здалёк пачуўся знаёмы голас, і ў пакой шпарка ўвайшоў начальнік аховы Холдэн. За яго спінай сціпла пераступаў з нагі на нагу Біяр. Ён, скарыстаўшыся валтузнёй, прывёў Холдэна, каб той заступіўся за Мінакоў. Ён яшчэ не ведаў, што той неаднаразова дапамагаў Мінакам. Але ў Біяра была цудоўная памяць, і ён уважліва прыслухоўваўся да размовы дарослых.

— Ахоўнік Холдэн! — малады службовец аддаў яму чэсць. — Я маю намер далажыць вам, што затрымаў Мінакоў і гэтую жанчыну, — ён паказаў на Рэмі, — якая аказала супраціўленне ўладам Горада.

Твар Холдэна асвяціла шырокая ўсмешка. Ён шырока раскінуў рукі і пайшоў да Марты. Прысутныя стаялі з разяўленымі ад здзіўлення ратамі.

— Ага! Вось ты і папалася, павучок на цыбатых ножках! — салодкім голасам прагаварыў Холдэн. — Колькі гадоў я шукаў цябе і не мог ніяк знайсці! Марта, якой ты стала прыгажуняй! Як даўно я цябе не бачыў! — ён радасна абняў аслупянелую Марту, а потым азірнуўся на ўсіх астатніх. — А вы што застылі?

Сітуацыя выглядала вельмі камічна. Біяр пачаў ціхенька пасмейвацца ў жменю, маці таксама. Ахоўнік няёмка пераступаў з нагі на нагу і раз-пораз папраўляў свой мундзір. Марта таксама заўсміхалася.

— Але ж добра, — працягваў Холдэн. — Прабачце, у нас надзвычайная сітуацыя, я павінен ісці. Вы пачакайце мяне, я абавязкова зайду да вас пасля змены, яна скончыцца праз пяць гадзін.

— Будзем чакаць! — з усмешкай прамовіла Марта.

Холдэн выйшаў, і малады ахоўнік пабег услед за ім.

— Што здарылася? Чаму вы іх не затрымалі? — пытаўся ён, — гэта ж Мінакі. Вы што? Не бачыце?

— Гэта мае сябры дзяцінства, — адказаў Холдэн. — Яны сапраўды прыйшлі ў госці. Я спадзяюся, што ты зразумееш мяне? — уважліва паглядзеў ён на падначаленага. — А цяпер пойдзем далей. У нас сёння процьма спраў.

— Вы не баіцеся, што заўтра Мінакі могуць прыйсці да вас? — ціхім шэптам спытаў малады чалавек. — Што яны могуць паклікаць вас з сабою?

— Не баюся!

— І пойдзеце разам з імі ў невядомае? — зрабіў вялізныя вочы ахоўнік.

— Канешне пайду. Яны ведаюць, куды ідуць.

Як толькі ахова выйшла з дома, жанчыны крыху перавялі дух, а Марта ліхаманкава пачала збірацца.

— А вось цяпер нам і сапраўды трэба ісці, — сказала яна. — Гэты малады чалавек хоча выслужыцца і абавязкова выкрые нас уладам. У нас ёсць некалькі гадзін. Я кепска ведаю гэтую частку Горада, а мапы, на жаль, у мяне няма.

— Біяр правядзе вас! — абнадзеіла сяброўку Рэмі.

— Твой сын?

— Ма-а-ам, ты сур'ёзна? — не паверыў сваім вушам хлопец. — Але ж ты…

— Т-с-с! — перапыніла яго мама. — Я ведаю, што ты дойдзеш. Апошнім часам Мінакоў становіцца ўсё больш і больш. Значыць, у гэтым ёсць нейкі сэнс. Я магу падацца вам вар'яткай, але некалькі хвілін таму я думала зусім іначай. Вы — такія бездапаможныя, без Біяра вам будзе цяжка. Ды і яму з вамі прыйдзецца нялёгка. Але я веру ў свайго сына. — Біяр парывіста абняў маці. — І я папрашу цябе, — звярнулася яна да сына, — пасля таго, як ты выйдзеш на паверхню, вярніся за сваёй старэнькай матуляй, я хачу таксама пабачыць сонца. — Яна змахнула некалькі сціплых слязінак.

— Рэмі, хадзем з намі, — ціха прамовіла Марта.

— Я не магу… Пакуль… — адказала ёй сяброўка. — Гэта так цяжка для мяне… — яна падштурхнула свайго сына да Мінакоў і зачыніла за імі дзверы. Потым павольна прысела на тапчанок і заплакала. Фрыя, якая засталася з маці, спешна падбегла да яе, абняла. Так яны і заснулі разам. Праз чатыры з паловай гадзіны ў іх кватэру ўварваліся ўзброеныя да зубоў ахоўнікі. Яны засталі даволі непрыглядную карціну: на падлозе ляжала мёртвая жанчына, а побач з ёй сядзела маленькая дзяўчынка і расчэсвала сваёй лялькі валасы. Калі ахоўнікі наблізіліся да дзяўчынкі, яна закрычала і закрыла тварык рукамі. Апошняе, што яна ўбачыла, гэта высокія наваксаваныя боты, якія растапталі яе цацку…

Мінакі былі ўжо далёка ў Старым Горадзе. Яны ішлі так хутка, як толькі маглі. Біяр сам неаднаразова праходзіў па гэтых калідорах, і таму ў першы дзень яны змаглі пераадолець вялікую адлегласць. А потым пачаліся праблемы. Людзей у Старым Горадзе было вельмі мала, і падарожнікі іх амаль не сустракалі. Калі хто і праходзіў, то гэта ў асноўным «прамыславікі», якія шукалі, чым пажывіцца, або «пакінутыя» — нямоглыя, старыя і хворыя, якіх Горад выкінуў са свайго нутра. Ахоўнікі самі амаль ніколі не заходзілі ў пакінутыя месцы. Чым далей рухаліся ў Стары Горад, тым менш бачылі святла. І гэта было галоўнай праблемай. Масла для ліхтара скончылася вельмі хутка, і давялося прыкладаць шмат намаганняў, каб захаваць сякі-такі агонь.

Да таго ж у падарожнікаў канчаліся сілы. Запасы ежы і вады вычэрпваліся. Калі яшчэ ваду зрэдку можна было знайсці, то ежу — ніяк. Усё было выграбена ўшчэнт, а што нельга было вынесці з сабой — сапсавана. Найбольш цяжка было бабулі і

малой Нэн. Мінакі па чарзе неслі дзяўчынку, а старую падтрымлівалі пад рукі. Гэта значна замаруджвала іх хаду. Стомленыя цяжкім шляхам, яны апынуліся ў адным з калідораў, па якім было бачна, што там нехта жыве. Мінакі, ледзь перастаўляючы ногі, уваліліся ў дзверы і паснулі на падлозе.

Біяр убачыў святло. Ён яшчэ ляжаў з заплюшчанымі вачыма, але святло было сапраўдным, цёплым, і гэта вельмі радавала. Хлопец ціха паварушыўся.

— Ён прачнуўся, — аднекуль, як праз вату, пачуўся голас Марты. — Беднае дзіця, ён так стаміўся.

— Біяр вялікі і мужны хлопец, — адказаў ёй чыйсьці да болю знаёмы голас. — Ён сапраўдны малайчына, што прывёў вас да мяне. Вы крыху адпачніце, і тады я адвяду вас на паверхню.

Біяр расплюшчыў вочы і паспрабаваў падняцца. Пакой, у якім ён апынуўся, быў цёплы і светлы. Побач з ім на невялікіх ложках спалі брат і дачка Марты. Па іх роўным дыханні Біяр здагадаўся, што з імі ўсё ў парадку. Марта сядзела ў кутку з нейкім чалавекам, і яны нягучна размаўлялі. Калі чалавек павярнуўся да хлопца, той адразу ж яго пазнаў. Гэта быў яго бацька!

— Тата? — голас хлопца выдаваў хваляванне. — Ты што тут робіш?

Бацька хуценька падхапіўся і абняў сына.

— Я тут працую. Выводжу людзей на паверхню, — сказаў ён. — Як там мама?

— Не ведаю. Я пакінуў іх унізе. Мы вельмі доўга ішлі, стаміліся. Дзе ты быў увесь гэты час?

— Нас не пускае ў Горад ахова, — ціха прамовіў бацька. — Так бы я даўно прыйшоў па вас. Таму я знаходжуся тут.

— А ўзяць сілай? — запытаўся сын.

— І пахаваць пад зямлёй мноства людзей? — татаў твар зрабіўся сур’ёзным. — Ты выйшаў, бо захацеў сам. Нехта — не хоча, кагосьці — не выпускаюць. Мы не ведаем дакладна, колькі людзей знаходзіцца ў Горадзе. Некалькі рухаў — і ўсе збудаванні могуць абваліцца. Уяві, колькі чалавечых жыццяў можна згубіць!

— Адкуль ты гэта ведаеш? — спытаў Біяр.

— Мы пракладалі новыя калідоры. Тады я заўважыў, што ўсё спецыяльна робіцца ненадзейна. Той, хто ведае сістэму размяшчэння калідораў і збудаванняў, можа лёгка заблакіраваць усе выхады. Зрабіць, напрыклад, абвал. І людзі будуць думаць, што гэта — трагедыя, і будуць баяцца.

— Так ты і стаў Мінаком? — падсумаваў размову сын.

— Прыблізна так, — адказаў бацька. — Мінакоў не надта бяруць у разлік, бо рэдкія з іх даходзяць да паверхні. А з тых, хто дайшоў, ніхто не вяртаецца назад.

— Я паабяцаў маме, што вярнуся, — уздыхнуў Біяр.

— Ты вернешся, абавязкова вернешся, — супакоіў яго тата. — А зараз хадзем за мной, я нешта пакажу табе. — Біяр асцярожна падняўся і рушыў услед за бацькам па калідоры. Яны падымаліся ўсё вышэй і вышэй. Навокал святлела, і памяшканне станавілася шырэйшым. Бацька моцна трымаў сына за руку. Першае знаёмства з навакольным светам магло адмоўна адбіцца на адчуваннях хлопца. Нарэшце яны аказаліся перад вялікімі шклянымі дзвярыма. Яны павольна адсунуліся, і ў твар Біяра падзьмула свежае ранішняе паветра. Ён заплюшчыў з усяе сілы вочы і скурчыўся каля бацькавых ног.

— Біяр, — ласкава паклікаў яго тата. — Паглядзі, якая прыгажосць!

Марудна, перамагаючы дрыжыкі ў нагах, хлопец падняўся, абапіраючыся на бацькаву руку, расплюшчыў вочы. Перад ім расцілалася неба, пакрытае белымі аблачынкамі, хвалістай стужкай сінела бясконцае мора. А там, з-за гор, падымалася ласкавае ранішняе сонейка.

ПАРТЫЯ Ў БІЛЬЯРД

— Дзе ты кажаш, працуе твой дзядок? — спытаў старшы лейтэнант Арцёмаў у свайго лепшага калегі і сябра Паўла Вознага.

— Працаваў раней, — удакладніў той, — медрэгістратарам у паліклініцы… А цяпер — на пенсіі. Давай хутчэй, а то спознімся, прымусім чакаць паважанага чалавека.

— Я не разумею, што мы будзем рабіць з тваім дзедам у більярдным клубе? — зноў спытаў Арцёмаў. — У нас і так вольнага часу мала, а тут яшчэ гэтае недарэчнае забойства.

— Так, зусім яно недарэчы, — пагадзіўся Павел. — Чалавек з-за мяжы прыехаў ладзіць бізнес, і вось… — Возны вытрымаў вялікую паўзу. Іх райаддзел і так стаяў «на вушах». Забойства замежнага бізнесмена падчас гульні ў більярд нарабіла шмат шуму ў горадзе. Міліцыя ў разгубленасці: чалавек толькі прыехаў, ні канкурэнтаў, ні ворагаў ніякіх не паспеў нажыць. Біяграфія, якую даслалі замежныя калегі, самая звычайная: разведзены, шмат працаваў, вельмі любіў більярд…

— Давай хутчэй, — злёгку штурхануў яго ў плечы Арцёмаў. — Я не спаў амаль дзве ночы, які з мяне ігрок?

— Дзядуля мае намер сказаць нам нешта важнае, — адказаў яму Павел, — а ты ж ведаеш, я більярдам не цікаўлюся зусім. Ён і папрасіў, каб я прывёў каго-небудзь накшалт цябе, прафесіянала…

— Ты што? — злосна зашаптаў Арцёмаў, — кожнага сустрэчнага знаёміш са складам крымінальных спраў? — ён пагардліва зірнуў на калегу.

— Выбачайце, маладыя людзі, — прагучаў раптам глыбокі аксамітны голас. Ён належаў падцягнутаму старому ў стыльным шэрым паліто. — Мне здаецца, я прымусіў вас чакаць.

— Нікольку, Стэфан Уладзіслававіч, — радасна звярнуўся да яго Павел. — Знаёмцеся, гэта мой сябар, вялікі аматар більярда Антон Арцёмаў.

— Вельмі прыемна, пан Заборскі да вашых паслуг, — прагаварыў стары прыгожым голасам і працягнуў руку. — Я — вялікі аматар більярда, шкада толькі, няма годных сапернікаў.

— Наўрад ці я буду вам сёння дастойным сапернікам, — стрымана адказаў на яго поціск Арцёмаў. — У нас на працы надзвычайная сітуацыя, таму больш як на паўгадзіны не разлічвайце.

— Не будзем марнаваць час, — зазначыў стары і яны накіраваліся да вольнага стала. Было бачна, што Заборскага тут ведаюць, хаця сам Арцёмаў нярэдка наведваў гэту ўстанову. Менавіта тут быў забіты замежнік, і Антон быў таму сведкам.

— Гуляеце на грошы? — спытаў Заборскі.

— З вамі? — не зразумеў Арцёмаў.

— Увогуле, — стары прапанаваў яму выбраць кій.

— З вамі магу за ідэю, — усміхнуўся старшы лейтэнант. — А так — толькі за грошы. Більярд — гульня для сапраўдных мужчын.

— Пачынайце партыю, — прапанаваў стары.

Нягледзячы на стомленасць, Арцёмаў пачаў вельмі добра, але і Заборскі не адставаў ад яго, а потым на сукне пачала дзеецца фантастыка. Павел, які назіраў за сапернікамі, стаяў увогуле з разяўленым ротам. Яго сталы сябар так віртуозна змагаўся з кіем, што напарніку даводзілася неаднаразова ўхіляцца ад магчымых удараў.

— Яшчэ? — спытаў Заборскі пасля таго, як прайшлі пазначаныя паўгадзіны.

— Можна крыху, — згадзіўся Арцёмаў. — Ваша гульня вельмі добрая, але я бачыў яшчэ лепшую. Тады была проста фантастыка!

— Вы, малады чалавек, гулялі з нябожчыкам? — спытаў дзед.

— Чаму гэта вас так цікавіць? — Арцёмаў падазрона зірнуў на Вознага.

— Крыху знаёмы з матэрыяламі справы, — дзед раптам зрабіў нечаканы ўдар і міліцыянер зразумеў, што прайграў. Ён шпурнуў кій на стол і зрабіў сябру знак кіравацца да выхада.

— Збягаеце з поля боя? — спыніў яго стары. — Я на вашым месцы ненадоўга затрымаўся б.

— Вы паказалі бліскучую гульню, але, на жаль, я не маю часу, — лейтэнант узяў пад казырок.

— Навошта вы забілі яго? — спакойна, нібыта нічога не адбылося, запытаў стары.

— Чаму вы думаеце пра мяне? — твар у Арцёмава выцягнуўся. — Вам не спадабалася гульня? Вам мала? Тады я магу застацца яшчэ на нейкі час. — Ён схапіў са стала кій і з усяе сілы рэзануў па шарах.

— Надзеньце яму наручнікі, Павел, — спакойна звярнуўся стары да Вознага.

— Гэта чорт ведае, што такое, — гучна крыкнуў Арцёмаў. — Адміністратар! — Возны маланкава скруціў яму рукі. — Што ты робіш? Звар'яцеў?

— Вы забілі гэтага чалавека, — ціха, але цвёрда прамовіў Заборскі. Да іх падышоў адміністратар, але Возны прад'явіў яму сваё пасведчанне, і той прапанаваў ім прайсці ў асобны кабінет. Там Арцёмаў ужо не скандаліў, але працягваў бурчаць:

— Збор ідыётаў, дзіцячы садок… Знайшлі крайняга… — Паўлу было шкада сябра, ён таксама нічога не разумеў і чакаў, што будзе адбывацца далей.

— Але ж менавіта вы забілі гэтага чалавека, — Заборскі зноў звярнуўся да Арцёмава.

— Паслухайце, — твар старшага лейтэнанта стаў налівацца крывёю. — Што вы трымаеце мяне за дурня? Зараз прыедзе машына, і тады смяяцца буду я, а вось… Адкуль вы ўвогуле прыдумалі, што я ведаў гэтага чалавека?

— Вы яго не ведалі, — сказаў дзед, — вы проста зрабілі неасцярожнасць і паказалі перад ім сваё майстэрства. А ён іграў нашмат лепш. Ваш кій перакрыў яму сонную артэрыю, на імгненне… Але ў яго было слабое сэрца. Звычайна тыя, хто гуляе з вамі ў смерць, адчуваюць пры ўдары лёгкае галавакружэнне, слабасць… Дні праз тры спыняецца іх жыццё…

— Ну, а матывацыя? — закрычаў Арцёмаў, — якая ў мяне была матывацыя? Не ведаеш, шкодны дзед? — ён прыўзняўся на сваім месцы, але наручнікі і хуткая рэакцыя напарніка прымусілі яго зноў прысесці.

— Якая матывацыя? — пытаннем на пытанне адказаў Заборскі. — Проста чалавек аказаўся не ў той час не ў тым месцы. Ну і яшчэ ваш гонар, малады чалавек. Вы прывыклі быць самым-самым лепшым. Каб я не ўхіліўся ад вас своечасова, то цяпер і для мяне выбіралі б труну…

Арцёмава адвезлі, а Павел яшчэ крыху затрымаўся каля старога Заборскага.

— Як вы так хутка пра ўсё здагадаліся? Я сам нават не ведаў такіх падрабязнасцей, — пацікавіўся міліцыянер.

— Мой хлопчык, калі-небудзь ты зразумееш, што залішні гонар і прага да лідарства могуць любога ператварыць у пачвару. Чалавек, які ходзіць па галовах, сам некалі падставіць пад чаравік сваю макаўку, — стары на хвіліну зірнуў на блакітнае неба. — А яшчэ я быў там і ўсё бачыў. Проста спачатку я падумаў, што гэта няшчасны выпадак.